Ваша Экселенцыя,

Прыміце мае сардэчныя віншаванні з нагоды 25-годдзя з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Швецыяй.

Рады адзначыць, што Швецыя стала адной з першых краін, якая прызнала незалежнасць Рэспублікі Беларусь яшчэ ў снежні 1991 года і менш чым праз месяц устанавіла з маладой беларускай дзяржавай дыпламатычныя адносіны.

За мінулую чвэрць стагоддзя ў беларуска-шведскіх адносінах назіраліся як перыяды ўздыму, так і прамежкі запавольвання. Але асабліва важна тое, што за гэтыя гады мы здолелі ўзрасціць узаемны давер. Гэта, безумоўна, з'яўляецца трывалым падмуркам для далейшага пашырэння беларуска-шведскага супрацоўніцтва і сумеснай работы на карысць нашых народаў і краін на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемнай павагі.

Бясспрэчна тое, што адносіны паміж Беларуссю і Швецыяй паступова сталі шматпланавымі. Значна паглыбілася супрацоўніцтва ў розных галінах.

Прыемна адзначыць, што мы падыйшлі да сённяшняй даты, аднавіўшы двухбаковую дыпламатычную прысутнасць. Упэўнены, што гэта дазволіць нам падтрымліваць і пашыраць плённы палітычны дыялог, паступова павышаць яго ўзровень.

Адзін з прыярытэтаў – развіццё гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння. Беларусь разглядае Швецыю як важнага эканамічнага партнёра ў рэгіёне. Мы зацікаўлены ў вывучэнні шведскіх перадавых інавацыйных дасягненняў у розных сферах, а таксама вопыту пабудовы сацыяльнага грамадства.

Працяг супрацоўніцтва ў галіне культуры, а таксама развіццё міжрэгіянальных кантактаў будуць спрыяць большаму ўзаемаразуменню паміж нашымі народамі.

Беларусь адкрыта для перагавораў па ўсіх пытаннях двухбаковага парадку дня ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай, гуманітарнай сферах, а таксама ў галіне забеспячэння правоў чалавека.

Беларусь і Швецыя належаць да аднаго Балтыйскага рэгіёна і, натуральна, падзяляюць як сумесныя рэгіянальныя выклікі, так і зацікаўленасць у яго стабільным і паспяховым развіцці. Агульнае разуменне галоўных праблем сучаснасці, нацэленасць на захаванне міру і стабільнасці на кантыненце і ва ўсім свеце ствараюць адзіную аснову для канструктыўнага ўзаемадзеяння на пляцоўках міжнародных арганізацый, у тым ліку ААН.

Перакананы, што сённяшні кантэкст беларуска-шведскіх адносін, іх пэўнае пераасэнсаванне як мага лепш спрыяюць паглыбленню і інтэнсіфікацыі двухбаковага супрацоўніцтва дзеля росквіту і дабрабыту нашых народаў.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей